(2000, № 6), Т.Кабржыцкай «Драматургічны геній Янкі Купалы» (2001, № 11). За гады існавання (1922—2002) часопіс адлюстраваў неадназначныя, супярэчлівыя этапы станаўлення і развіцця бел. літаратуры, маст. культуры, тэатра і драматургіі, апублікаваў больш як сотню драм. твораў, якія ўвайшлі ў рэпертуар нац. тэатраў.

*Літ.*: Конон В. На рубежах утверждения: (к 60-летию журнала «Полымя») // Неман. 1982. № 12. *У.М.Конан.*

**«ПО́ЛЫМЯ РЭВАЛЮ́ЦЫІ»**, назва час. *«Полымя»* ў 1932—41.

**ПО́ЛЬСКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ ВАНДРО́ЎНЫ ТЭА́ТР БССР**. Існаваў у 1929—35 з асн. базай у Мінску. Створаны з удзельнікаў тэатр. гуртка польскай моладзі пры клубе імя Р.Люксембург (1927—29). Маст. кіраўнік Э.Багінскі, з 1933 Я.Танальскі. У першыя гады пры тэатры працавалі кароткатэрміновыя драм. курсы. З 11.7.1932 называўся Дзярж. польскі тэатр БССР імя 11 ліпеня, меў стацыянарную базу ў будынку Мінскага Чырвонага касцёла. Напачатку ў рэпертуары пераважалі аднаактовыя п'есы, скетчы, канцэртныя праграмы. Сярод пастановак: «Недаростак» Дз.Фанвізіна (1931), «Армія міру» Ю.Нікуліна (1932), «Мараль пані Дульскай» Г.Запольскай (1933), «Узнятая цаліна» паводле М.Шолахава, «Гібель эскадры» А.Карнейчука (абедзве 1934), «Карчмарка» К.Гальдоні, «Сям'яВаранцоў» В.Кавальскага (абедзве 1935). У спектаклях ігралі акцёры І.Багінская, Ю.Галавач, В.Окалаў, А.Ротар, З.Стома, К.Стэцкі, К.Мацкевіч, В.Татаржыцкая, В.Тышкевіч, І.Худніцкі. *М.А.Каладзінскі.*

**ПО́МАЗАЎ** Віктар Пятровіч (23.6.1949, в. Юркавічы Гомельскага р-на — 14.5.1986), кампазітар. Дзярж. прэмія Беларусі 1986. Скончыў Бел. кансерваторыю (1976, клас П.*Падкавырава*). Тэатральная музыка — адна з яскравых старонак творчасці кампазітара, дзе найноўшая муз. стылістыка цесна пераплятаецца з фалькл. элементамі. Аўтар музыкі да больш як 10 драм. спектакляў і радыёпастановак, у т.л. ў Дзярж. т-ры лялек Беларусі: «Арэшак» Р.Аляксандравай (1977), «Зорны хлопчык» паводле О.Уайльда і «Званы твайго лёсу» А.Вольскага і П.Макаля (1978), «Салавей» паводле Х.К.Андэрсена (1980), «Доктар Айбаліт» В.Карастылёва (1982), «Хачу быць богам, або Спакушэнне Гефеста» А.Вярцінскага, «Чароўная лямпа Аладзіна» Н.Гернет і «38 папугаяў» Р.Остэра (1983); у Гродзенскім абл. т-ры лялек: «Запалка-невялічка» Г.Сцяфанава (1983), «Балада пра белую вішню» С.Клімковіч (1984); у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі — «Бабскае царства» паводле Ю.Нагібіна (1984); у Магілёўскім абл. т-ры драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча — «Камедыянт, або Узнёсласць сумнае надзеі» А.Асташонка (1985) і інш.; да радыёспектакляў «Раман і Юлька» (1980), «Гномы» (1981). Тэатральнай музыцы П. ўласціва цеснае спалучэнне найноўшай муз. стылістыкі з фалькл. элементамі. *Т.Г.Мдывані.*



Г.П.**Праватораў**.

**ПРАВАТО́РАЎ** Генадзь Панцеляймонавіч (н. 11.3.1929, Масква), расійскі і бел. дырыжор, педагог. Нар. арт. Расіі (1981). Дзярж. прэмія Беларусі 1997. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю па кл. фп. ў А.Гальдэнвейзера (1952) і дырыжыравання ў А.Гаўка (1956). З 1960 дырыжор, гал. дырыжор у муз. т-рах Расіі, у т.л. Маскоўскага т-ра імя К.Станіслаўскага і У.Неміровіча-Данчанкі, Ленінградскага Малога т-ра оперы і балета, Адэскага т-ра оперы і балета і інш. У 1984—89 гал. дырыжор Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. З 1994 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Мінскага духавога аркестра «Няміга», з 1998 гал. дырыжор Дзярж. сімфанічнага аркестра Беларусі. З 2002 гал. дырыжор і маст. кіраўнік сімфанічнага аркестра Нац. дзярж. тэле.-радыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. З 1986 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі (з 1994 праф.). Гал. працы на бел. сцэне: оперы «Вайна і мір» С.Пракоф'ева (1985), «Кавалер руж» Р.Штрауса (1987), «Візіт дамы» С.Картэса (1995); балеты «Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага, «Вясна свяшчэнная» І.Стравінскага (абодва 1986), «Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева (1988), «Страсці» («Рагнеда») А.Мдывані (1995), «Мефіста» У.Кандрусевіча (2002, Бел. дзярж. муз. тэатр) і інш. *А.Л.Карацееў.*

**ПРАГРА́МА ТЭАТРА́ЛЬНАЯ**, 1) змест канцэрта, эстраднага ці цыркавога прадстаўлення. 2) Друкаваны паказальнік спектакля, канцэрта, эстраднага ці цыркавога прадстаўлення. У П.т. змяшчаецца назва п'есы або нумара, указваюцца аўтар, рэжысёр, пастаноўшчык, мастак, кампазітар і інш., пералічваюцца дзеючыя асобы і іх выканаўцы. У праграме-лібрэта даецца яшчэ і сціслы пераказ спектакля або нумара.

**«ПРАДА́ДЗЕНАЯ НЯВЕ́СТА»**, камічная опера ў 3 дзеях Б.*Сметаны*. Напісана ў 1866. Лібрэта К.Скабінай. На сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі паст. ў 1949 (дырыжор У.Пірадаў, рэж. Б.Мардвінаў, мастак П.Масленікаў, хормайстар Г.Пятроў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ